То бок праўладныя мітынгі праводзяць улады, мабілізуючы супрацоўнікаў дзяржаўнага апарату і часткова бюджэтнікаў для падтрымкі самой улады. То бок самі для сябе. І абвяшчаюць гэта нейкай народнай акцыяй.

Значыць, суцэльная імітацыя народнай падтрымкі. Прычым усе разумеюць, што гэта імітацыя. Гэта разумее тая антылукашэнкаўская большасць, якая выходзіць на акцыі пратэсту. Гэта добра разумее наменклатура, якая сама іх арганізуе.

Тады навошта і для каго ладзіцца гэтая імітацыя?

Тут варта зазначыць, што ўся дзяржаўная сістэма цалкам заснавана на імітацыі. У Беларусі няма нармальнага парламента, мясцовых Саветаў, Канстытуцыйнага суда, судовай сістэмы, прафсаюзаў, выбараў і шмат чаго іншага. Ёсць толькі іх сурагаты. Для такой сістэмы імітацыя – норма.

ГЛАСНОСТЬ

Собрать все преступления власти

Как известно, в Беларуси после президентских выборов Конституция была нарушена властью несчетное количество раз. А насилие над мирными гражданами превзошло все мыслимые и немыслимые примеры. Чтобы ни один факт унижения и нарушения прав человека не был забыт, стерт из памяти, сторонниками перемен создан интернет-проект «23.34» – по номеру статьи Кодекса об административных правонарушениях, которую власти сейчас активно используют против граждан. Авторы проекта – Координационный совет, Международный комитет по расследованию пыток в Беларуси, штаб экс-претендента на пост президента Виктора Бабарико, незарегистрированный правозащитный центр «Весна», платформа «Голос», инициатива «Честные люди».

Во-первых, проект нужен для того, чтобы дополнительно помочь людям, прошедшим через репрессивную машину государства, а во-вторых, также для того, чтобы обязательно сохранить в коллективной памяти преступления власти в месяцы после выборов.

Проект начал действовать только 23 октября (это сайт, где каждый может изложить свою историю). Но уже через два дня он собрал более 1000 свидетельств. Новые заполненные анкеты продолжают поступать.

После анализа собранной информации руководители проекта начнут публиковать статистику, сколько человек в Беларуси получили незаконные штрафы, повестки в суд, какие судьи стали «рекордсменами» по вынесению незаконных приговоров. Все факты о неправедно осужденных, избитых, униженных и оскорбленных в РУВД Беларуси не должны стереться из коллективной памяти.

Если вы пострадали, напишите об этом на сайт «23.34.net».

Кирилл БУБНОВ.

ХОЧУ СКАЗАТЬ...

В чем заслуга Лукашенко? В том…

что Беларусь – единственная из европейских стран – не входит в такую авторитетную международную организацию, как Совет Европы, которая объединяет более 40 государств, в том числе Армению, Азербайджан, Грузию, Турцию, Россию;

что Беларусь из более чем 40 Международных документов по правам человека ратифицировала только 5, касающихся отдельных аспектов этого вопроса;

что вся страна опутана сетью вертикали, которая относитесь к гражданам Беларуси как к марионеткам, которые должны подчиняться воле одного человека;

что мы, граждане Беларуси, практически лишены возможности избирать своих представителей в высшие органы власти;

что подписи членов участковых избирательных комиссий под итоговым протоколом по результатам выборов за 9 августа 2020 года были собраны задолго до начала голосования избирателей;

что лучшие представители нации томятся в тюремных застенках;

что людей, отстаивающих свои законные права, подвергают пыткам и издевательствам;

что суды страны вместо защиты тех людей, которые потерпели от пыток и издевательств силовиков, выносят по их обращениям обвинительные приговоры;

что карательная машина не щадит ни женщин, ни стариков, ни инвалидов;

что большинство пенсионеров, честно отработавших всю жизнь на государственных предприятиях и в учреждениях, влачат нищенское существование;

что для того, чтобы осуществить зубопротезирование, пенсионерам необходимо нередко отказываться от расходов на питание и от других расходов в течение нескольких месяцев;

что проезд на любом городском транспорте пенсионеры должны оплачивать в полном размере;

что часть малоимущих пенсионеров вынуждена платить арендную плату за жилье, в котором они проживают;

что блокируются независимые СМИ, сайты;

что отнимается у рабочих конституционное право на забастовку;

что на содержание силовых структур идет значительная часть бюджета страны, который пополняется за счет труда ее граждан.

Вот что вы, господин-товарищ Лукашенко, «подарили» белорусскому народу.

Людмила КЛИМКОВИЧ, философ.

ПАМЯЦЬ

Шарля дэ Голя ўвекавечаць у Шчучыне ў вобразе капітана

Бронзавы помнік будзе ўстаноўлены на пляцоўцы побач з месцам, дзе ў гады Першай сусветнай вайны Шарль дэ Голь, захоплены немцамі ў палон, знаходзіўся ў заключэнні.

"Народная Воля" яшчэ летась пісала аб тым, што першы прэзідэнт Пятай Французскай Рэспублікі з ліпеня па верасень 1916 года знаходзіўся ў нямецкім палоне ў беларускім горадзе Шчучыне Гродзенскай вобласці.

Казармы, у якіх жылі французскія палонныя, месціліся ў былой лесапілцы князёў Друцкіх-Любецкіх. Зараз на гэтым месцы вытворчае памяшканне завода "Аўтапровад".

Вышыня помніка, які будзе ўсталяваны на пляцоўцы побач з будынкам завода, – каля 2,5 метра. Скульптурная кампазіцыя пакажа вядомага французскага палітыка маладым капітанам 33-га палка, які стаіць, скрыжаваўшы рукі на грудзях.

Фонам будзе служыць паўкруглая сцяна – як сімвал шляху ад простага палоннага капітана да лідара французскага супраціўлення і палітычнага дзеяча. Па абодва бакі скульптуры ўсталююць дзве стэлы: на адной будуць апісаны падзеі, якім прысвечаны мемарыял, а на другой выяўлены сімвалы прэзідэнта Французскай Рэспублікі.

Гэтая кампазіцыя перамагла ў конкурсе эскізных праектаў. Дарэчы, усяго ў ім бралі ўдзел 12 аўтараў. Фундатарам праекта будзе французскі грамадзянін, які мае бізнес у Беларусі.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

БЕЗ СРОКА ДАВНОСТИ

Расплата за жестокости и пытки неотвратима!



Об авторе

Гарри Петрович Погоняйло родился 14 октября 1943 года.

После службы в армии окончил юридический факультет Белорусского государственного университета. В 1970–1971 годах заведовал юридической консультацией в городе Костюковичи. В 1971 году избран народным судьей Быховского районного суда. В 1979–1989 годах – заведующий отделом адвокатуры Министерства юстиции БССР.

С 1989 года вел адвокатскую практику, был президентом Союза адвокатов Беларуси. Участвовал в ряде резонансных дел, защищая, в частности, поэта Славомира Адамовича, бывшего председателя Национального банка Беларуси Тамару Винникову, журналистов телеканала ОРТ Павла Шеремета и Дмитрия Завадского. В 1998 году адвокатская лицензия Погоняйло была отозвана.

В 1997 году Гарри Погоняйло вошел в число ста белорусских гражданских деятелей, первыми подписавших Хартию'97. С 1998 года занимает должность председателя юридической комиссии РПОО «Белорусский Хельсинкский комитет».

30 сентября 2020 года Светлана Тихановская уполномочила его быть «представителем по правам человека».

Генералы силовых структур, старшие офицеры и их подчиненные, прокуроры, следователи и судьи сегодня упиваются своей безнаказанностью, но при этом поучают граждан соблюдать закон и общественный порядок. Они, видимо, рассчитывают, что нынешняя власть вечна, а гарант, взявший на себя ответственность за убийства мирно протестующих, произвольные задержания, непропорциональное применение силы, незаконное лишение свободы, содержание в заключении, акты жестокости и пытки, позволит им избежать ответственности за содеянное. Наверное, они забыли или считают, что всеобщий и фундаментальный принцип неотвратимости наказания на них не распространяется.

Для всех понятно, что речь в данном случае идет о последних событиях и преступлениях, потрясших страну и всё цивилизованное сообщество. И если власти Беларуси бездействуют и демонстрируют глумливое отношение к жертвам насилия, то международная общественность однозначно и четко заняла позицию осуждения и требует прекратить насилие, уважать человеческое достоинство, права и свободы человека.

Правозащитные организации страны в своих обращениях к органам власти и должностным лицам выступают с аналогичными требованиями: возбудить уголовные дела и привлечь к ответственности виновных лиц. Одновременно мы обратили внимание на то, что в соответствии с международным правом и национальным законодательством никакие исключительные обстоятельства, в том числе внутренняя политическая нестабильность, не могут служить оправданием пыток, а приказы вышестоящих начальников или представителей государственной власти являлись сами по себе преступными и не подлежали выполнению. Незнание этих предписаний закона не может служить оправданием и не освобождает виновных от ответственности.

Сегодня у нас имеются все основания и достаточные данные, а также доказательства того, что власти бездействуют. Ни по одному из заявлений граждан (а их, по утверждению Следственного комитета Республики Беларусь, около 2 тысяч) о применении пыток, актов жестокости, в том числе повлекших смерть потерпевших, причинение тяжких и менее тяжких телесных повреждений, дела не возбуждены. Обратившиеся получают бюрократические отписки, и их вера в то, что просьбы о привлечении к ответственности будут реализованы в соответствии с законом в установленном процессуальном порядке и сроки, иссякает.

Вместо сострадания к жертвам, принятия оперативных мер по восстановлению их прав власти демонстрируют подлый и циничный подход: они возбуждают против потерпевших административные дела за незаконное участие в массовых акциях, неповиновение сотрудникам милиции, пропускают через послушные суды, то есть делают граждан виноватыми, с тем чтобы на основании вынесенных судебных постановлений в последующем отказать в возбуждении уголовных дел и обелить преступников. Более того, по сообщению Генерального прокурора, территориальные органы Следственного комитета возбудили около 400 уголовных дел на протестующих и готовят их для передачи в суды.

В этих условиях правозащитники не только призывают к борьбе с безнаказанностью, возмещению ущерба, недопущению и предотвращению повторных грубых нарушений прав человека и серьезных нарушений международного гуманитарного права, но и активно используют весь арсенал международно-правовых механизмов в области обеспечения и защиты прав человека (Верховный комиссариат ООН по правам человека, тематические спецдокладчики и комитеты ООН).

Во второй раз в истории современной Беларуси задействован «Московский механизм» ОБСЕ. Назначенный государствами-членами этой региональной организации специальный эксперт и его аппарат проведут глубокое и объективное расследование фактов пыток, жестокого, бесчеловечного и унижающего достоинство обращения в отношении граждан, задержанных на массовых мирных акциях протеста.

С аналогичными задачами комитет Парламентской ассамблеи Совета Европы по юридическим вопросам и правам человека предложил учредить международный следственный комитет по преступлениям, совершенным в Беларуси во время и после выборов. К сотрудничеству в расследовании предполагается привлечь представителей белорусских властей и гражданского общества. По крайней мере правозащитники готовы направить заинтересованным сторонам все имеющиеся по этим фактам сведения и доказательства. И самое главное в этой работе – **результаты специальных расследований будут опубликованы и представлены национальным и международным правоохранительным органам, которые хотят и готовы преследовать виновных лиц за массовые преступления против человечества, совершенные должностными лицами Беларуси в официальном статусе**.

Эти тяжкие деяния носят углубленный и преднамеренный характер и должны быть осуждены государствами как нарушение прав и основных свобод человека, провозглашенных во Всеобщей декларации прав человека, Международном пакте о гражданских и политических правах, Конвенции против пыток, других международных актов в области прав человека, которые Республика Беларусь признает, ратифицировала, а значит, взяла на себя обязательства соблюдать их и нести ответственность.

В этой связи хочу напомнить, что Республика Беларусь является одним из соучредителей ООН (1945 год). Отцы-основатели современной Беларуси в ч.1 ст.8 Конституции закрепили, что государство *«признает приоритет общепризнанных принципов международного права и обеспечивает соответствие им законодательства»*.

Республика Беларусь, будучи последовательной в своем стремлении показать мировому сообществу, что она следует указанным принципам, ввела в Закон «О международных договорах Республики Беларусь» положение, что общепризнанные принципы международного права и нормы международных договоров Республики Беларусь, вступивших в силу, являются частью действующего на территории Беларуси права (ст.15). Поэтому вполне логичным и обоснованным является закрепление в Уголовном и Уголовно-процессуальном кодексах Республики Беларусь (вступили в силу с 1 января 2001 года) правила о том, что УК основывается на Конституции Республики Беларусь и общепризнанных принципах и нормах международного права (ч.3 ст.1), а УПК – что «международные договоры Республики Беларусь, определяющие права и свободы человека и гражданина, в уголовном процессе применяются наряду с настоящим кодексом».

Таким образом, Беларусь реализовала на законодательном уровне свою приверженность обеспечению прав и свобод граждан и имплементировала (внесла) сложившиеся международные стандарты в свое национальное законодательство.

А на практике? Сегодня все большее число наших граждан, отслеживая складывающуюся ситуацию, оценивая ее с позиции обеспечения и фактической реализации прав и свобод граждан, которые по Конституции объявлены **высшей ценностью и целью общества и государства**, приходят к обоснованному и горькому для них выводу: в стране царит правовой дефолт. Государство разорвало конституционный договор и сняло с себя ответственность за создание условий для действительно свободного и достойного развития личности (ст.2) и освободило себя от гарантий обеспечения прав и свобод граждан, закрепленных в Конституции, законах и предусмотренных международными обязательствами Беларуси (ст.21).

Среди многочисленных международных обязательств Беларуси важное место занимает борьба против пыток или актов жестокости, незаконного содержания в заключении, систематического осуществления казни без суда, похищения людей, за которыми следует их исчезновение, совершаемые в том числе в связи с политическими убеждениями. Перечисленные деяния во исполнение международных договоров Республики Беларусь закреплены **в статье 128 УК в главе 17 (Преступления против мира и безопасности человечества)**.

В соответствии с ч.5 ст.12 УК Беларуси данные преступления по характеру и степени общественной опасности относятся к особо тяжким, так как законом предусмотрено наказание в виде лишения свободы на срок свыше 10 лет, пожизненного заключения или смертной казни. Наряду с этим сроки давности при совершении указанных преступлений не применяются (ст.85 УК).

Следует особо подчеркнуть: новеллой действующего Уголовного кодекса является то, что, **содержащиеся в его главе 17 составы преступлений преследуются в уголовном порядке независимо от того, совершены ли они на нашей территории или вне ее пределов, если совершенные деяния признаны преступлениями в государстве, на территории которого они были совершены, и виновные лица не понесли уголовную ответственность в этом государстве (ст.6 УК).** В данном случае речь идет о так называемой универсальной уголовной юрисдикции, которая закреплена в уголовно-правовом законодательстве на основании обязательного для Республики Беларусь международного договора.

Аналогичные правила о действии уголовного закона в пространстве и во времени закреплены и в большинстве стран мира, в их числе страны Евросоюза, Совета Европы, региона ОБСЕ и других. Они соответствуют основополагающему принципу **aut dedere aut punire** (или выдать, или наказать) виновного в совершении международного преступления. Это и есть выполнение (следование) уже упомянутому выше принципу неотвратимости наказания.

Таким образом, уголовное законодательство в этой части практически в полной мере отвечает складывающейся практике международного публичного права и позволяет на национальном уровне преследовать вне зависимости от гражданства и места жительства любое лицо, совершившее преступление против человечества.

Так мы, правозащитники, полагали, направляя обращения в Следственный комитет Беларуси о возбуждении уголовных дел по признакам ст.128 УК, но получили отказы. И тогда граждане-жертвы насилия, выехавшие за рубеж, совместно с правозащитными организациями, адвокатами, правительственными учреждениями ряда стран активно приступили к практической реализации универсальной юрисдикции, которыми эти страны располагают и где она может быть эффективно применена. Прежде всего в тех странах, которые имеют с Беларусью соответствующие международные договоры об оказании юридической помощи по уголовным, гражданским и административным делам (Украина, Польша, Чехия, Литва, Латвия и другие). В сфере борьбы с преступностью имеются и другие международные договоры, заключенные на межгосударственном уровне и между профильными министерствами и ведомствами стран. Сбор и закрепление доказательств по данным делам не представляют особых трудностей для тех, кто на профессиональной основе будет проводить расследование. Единственным, но вполне преодолимым препятствием может стать отказ компетентных органов Беларуси сотрудничать с зарубежными коллегами, в том числе и по вопросам выдачи (экстрадиции) виновных в те страны, которые будут требовать выполнения этих обязательств по международным договорам. Их невыполнение может обернуться для белорусской стороны крайне негативными последствиями в борьбе с преступностью и выдачей скрывающихся за рубежом лиц, объявленных в Беларуси в международный розыск через структуры Интерпола.

Для жертв преступлений важно:

чтобы следователи, прокуроры, судьи по результатам расследования дел в отношении виновных избрали меру пресечения и выдали международные ордера на их арест в любой стране;

чтобы по гражданско-правовым искам потерпевших из Беларуси были удовлетворены требования о компенсациях за счет имущества государства (вспомним о принятом в США Законе Магницкого).

По этой же схеме по правилам и процедурам универсальной уголовной юрисдикции могут быть возбуждены уголовные дела по исчезнувшим в Беларуси 20 лет назад известным людям: Ю.Захаренко, В.Гончару, А.Красовскому, Д.Завадскому. Их дела в родной стране приостановлены производством и фактически не расследуются с 2001 года по воле Лукашенко. Но в ряде стран Запада проживают родственники исчезнувших, которые признаны потерпевшими по уголовным делам. Готов дать признательные показания один из участников насильственных похищений и внесудебных казней Юрий Гаравский. Мы знаем еще о нескольких лицах, готовых сотрудничать со следствием, иными структурами зарубежных государств, имеются также документы предварительного расследования уголовных дел, проводимого в Беларуси, и всё это может привести к положительному результату.

Могу с удовлетворением сообщить, что в соседних с Беларусью странах, куда выехали наши граждане, спасаясь от преследований, процессы возбуждения и расследования дел по имеющимся у них процедурам универсальной юрисдикции уже идут. Списками первоочередных лиц, подозреваемых по фактам жестокостей и пыток, внесудебных казней, произвольных задержаний, незаконного содержания под стражей, уполномоченные органы располагают. Это прежде всего те, кто внесен в санкционные списки. Среди них: министр внутренних дел Республики Беларусь Караев, его заместители, начальники территориальных УВД, ЦИПов, ИВС, иных мест заключения, где применялись пытки, командиры ОМОНа, отдельные следователи, прокуроры и судьи, совершившие преступления против правосудия, действия которых также подпадают под признаки международных преступлений против человечества при условиях, влекущих их ответственность по универсальной юрисдикции.

Тогда, когда страна скатилась к применению массовых репрессий за свободу высказывать свои убеждения, мирно протестовать против нарушений законности, когда власти прибегают к применению уголовных санкций как к инструменту в политической борьбе со своими оппонентами, хочу напомнить всем должностным лицам правоохранительных органов и судьям об их личной ответственности.

Надеюсь, многие помнят, что после известного Нюрнбергского процесса над военными преступниками Германии прошли суды над прокурорами, следователями, судьями, которые обвинялись в массовых репрессиях. Все они в свою защиту ссылались на выполнение предписаний действующих тогда законов фашистской Германии. Однако трибуналами было признано, что эти законы и практика их применения не соответствовали принципам правового демократического государства, что они были направлены **против человечества и исполнители должны были осознавать это**. Именно тогда появилось и было введено в оборот понятие «преступный закон». А исполнители – признаны виновными и осуждены. Кто-то лишился профессиональных званий и привилегий. На эти цели работают и законы о люстрации, которые могут быть приняты в Беларуси после победы над диктатурой.

Каждому воздастся по заслугам его!

Гарри ПОГОНЯЙЛО, экс-судья, адвокат, ныне уполномоченный лидером Республики Беларусь Светланой Тихановской народный омбудсмен по правам человека в Республике Беларусь.

МЕРКАВАННІ

Парламент павінен быць аднапалатным

Цяпер у грамадстве актыўна абмяркоўваюцца тыя змены, якія неабходна ўнесці ў дзеючую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. На мой погляд, няма неабходнасці мець у рэспубліцы двухпалатны парламент. Цяпер акрамя Палаты прадстаўнікоў існуе і Савет Рэспублікі. Ён як быццам мае пэўныя паўнамоцтвы. Адно з іх – разгляд і зацвярджэнне законаў, якія прыняты Палатай прадстаўнікоў. Але за 24 гады я не памятаю, каб Савет Рэспублікі адхіліў які-небудзь законапраект, прыняты Палатай прадстаўнікоў, каб была створана пагаджальная камісія з прадстаўнікоў абедзвюх палат. Гэты орган, я лічу, носіць чыста дэкаратыўны характар і ніяк не ўплывае на эканамічнае і сацыяльнае развіццё Беларусі.

Раней па тэлебачанні часта паказвалі рабочыя паездкі па краіне А.Лукашэнкі, і сярод світы, якая яго суправаджае, амаль заўсёды можна было бачыць старшыню Савета Рэспублікі Н.Качанаву, якая старанна заносіла ў блакнот часта банальныя разважанні Аляксандра Рыгоравіча. У такой адказнай асобы, напэўна, павінны быць іншыя заняткі. Дзеля таго каб занатоўваць выступленні прэзідэнта падчас паездак, дастаткова было б пасляць нейкую стэнаграфістку. На маю думку, тыя сродкі, якія ідуць на ўтрыманне Савета Рэспублікі, можна было б выкарыстаць у сферах аховы здароўя, адукацыі, навукі і гэтак далей.

Другая прапанова. Згодна з артыкулам 17 дзеючай Канстытуцыі, дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская. Але чамусьці законы прымаюцца толькі на рускай мове. Нават у савецкія часы Вярхоўны Савет прымаў законы на беларускай мове. Неабходна гэты падыход замацаваць у новай рэдакцыі Канстытуцыі.

П.РОГАЧ, пенсіянер.

Мінск.

ПАНДЭМІЯ

27-гадовая мінчанка другі раз захварэла на каранавірус

У Беларусі імкліва расце колькасць хворых на каранавірус. За апошнія суткі афіцыйная статыстыка паведаміла пра яшчэ 845 выпадкаў. Прычым некаторыя людзі хварэюць паўторна.

Марыі Кісялёвай 27 гадоў. Першы раз яна захварэла ў маі. Мяркуе, што заразілася на працы – у калегі за пяць дзён да гэтага пацвердзіўся каранавірус.

«Больш не было дзе падчапіць. Тады я прытрымлівалася сацыяльнай дыстанцыі, амаль не была ў крамах, усё замаўляла па дастаўцы. На працу і назад ездзіла на машыне», – расказвае жанчына.

У першыя дні хваробы ў яе ўзнялася тэмпература да 38 градусаў, пачаўся кашаль. Марыя выклікала доктара.

«Мне два тыдні не хацелі рабіць тэст. Я хадзіла раз на некалькі дзён, як звычайна пры прастудзе, у паліклініку.

Спачатку прызначылі адзін антыбіётык, потым другі, потым трэці – і нічога не дапамагала. Тэмпература ўсё адно была, толькі знілася да 37,5. Схадзіць у паліклініку і назад было фізічна цяжка. Цэлы дзень хацелася спаць, не было сіл», – успамінае Марыя.

Калі мазок нарэшце ўзялі, сумневаў не засталося – каранавірус. Жанчыне таксама рабілі рэнтген, каб выключыць пнеўманію. Агулам на бальнічным мінчанка правяла 40 дзён. Але і пасля хваробы сілы вярнуліся не адразу, некалькі тыдняў давялося абмяжоўваць фізічную актыўнасць.

Марыя пазней стала донарам плазмы: убачыла аб'яву на сайце 6-й бальніцы і запісалася. Антыцелы яна здавала чатыры разы, апошні – месяц таму.

Пра каранавірус яна не ўспаміналу, пакуль у пятніцу 16 кастрычніка зноў не адчула знаёмыя сімптомы: тэмпература 37,5, кашаль, слабасць. Некалькі дзён Марыя дрэнна адчувала смак.



«Спачатку падумала: восень, усё можа быць, ВРВІ. Пасля выхадных звярнулася ў паліклініку. Доктарка сказала, што тэстаў няма ў наяўнасці, маўляў, хочаце – рабіце самі. Больш для самазаспакаення я ў пятніцу з'ездзіла ў прыватную лабараторыю і здала экспрэс-тэст на антыцелы».

Экспрэс-тэст паказвае, ці ёсць у крыві імунаглабуліны M і G. Першыя сведчаць пра тое, што ў арганізме свежая інфекцыя. Другія – што ў адказ на каранавірус выпрацаваліся антыцелы (але як даўно, не вядома). У Марыі выявілі абодва віды імунаглабулінаў.

«Калі здавала тэст, я падпісвала пагадненне, што, калі ў мяне знойдуцца антыцелы M, якія паказваюць, што ты хварэеш у цяперашні час, лабараторыя перадасць мае дадзеныя ў санстанцыю і паліклініку».

Марыя адзначае, што адчувае сябе лепш, чым у мінулы раз. Яна яшчэ працягвае лячэнне.

(NN)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы не здаліся і не апусцілі рукі!»

«Народная Воля» пацікавілася, як справы ў бізнесмена і стваральніка крамы symbal.by ***Паўла Белавуса****.*

Як паведамляла «Народная Воля», 23 чэрвеня крама абвясціла аб сваім закрыцці з-за празмернага ціску з боку ўлад. Беларусы адразу выстраіліся ў чаргу па вышымайкі, але прыехаў аўтазак, і іх пачалі затрымліваць. Сярод затрыманых тады быў і тэлевядоўца Дзяніс Дудзінскі.

– Павел, якія навіны? Можа, хутка адкрыецеся?

– Мы да гэтага часу з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях разбіраемся. Цалкам перараблялі пажарную сістэму, адпаведную дакументацыю. А калі да нас прыходзілі з чарговым рэйдам, дык знайшлі новыя парушэнні. То бок да гэтага часу мы як фізічная крама яшчэ не можам працаваць – працягваем выпраўляць тое, на што ўказана.

– Як я зразумела, вы хочаце гэтую кропку на праспекце Машэрава захаваць?

– Так. Мы там і засталіся – гэтая кропка зараз працуе як офіс нашай інтэрнэт-крамы. Мы сёння фактычна вярнуліся да таго, з чаго і пачыналі: інтэрнэт-крама, дастаўка поштай і кур'ерскай службай па Мінску і Беларусі. У гэтым плане мы працу не спынялі.

– Што вам яшчэ трэба зрабіць, каб аднавіць працу крамы?

– Мы цалкам перарабілі пажарную сістэму, каб яна адпавядала ўсім магчымым сучасным нормам, але цяпер у правяраючых служб узніклі нараканні ўжо не да пажарнай сістэмы, а да вентыляцыі – трэба нейкія спецыяльныя датчыкі паставіць. І калі мы гэта даробім, яны чарговы раз прыйдуць і дадуць сваю рэзалюцыю – дапускаць памяшканне да эксплуатацыі ці не.

– З вентыляцыяй сур'ёзная праблема?

– Не вельмі, трэба паставіць дадатковае абсталяванне, але крыху забюракрытазаваная сістэма. Мы спачатку павінны звярнуцца ў абслугоўваючую кампанію, якая зробіць праект, паставіць патрэбнае абсталяванне, пасля пажарная інспекцыя павінна даць свой допуск. Потым мы павінны зноў запытацца ў пажарных, ці можам выкарыстоўваць памяшканне. Цяганіна, адным словам!

– І колькі гэта па часе зойме, па вашых падліках?

– Ну калі з першым пытаннем мы разбіраемся ўжо два месяцы, думаю, яшчэ месяц дакладна спатрэбіцца. Калі не знойдуць нейкія новыя зачэпкі. Але, у прынцыпе, мы не вельмі хвалюемся. Праца ідзе, замоў хапае, мы працуем, прычым даволі эфектыўна. Не сёння, дык праз месяц ці два адчынімся і пачнём працаваць. Пакуль і агулам ў краіне сітуацыя такога падвіслага неразумення: што будзе далей? Мы не скардзімся, бо бачым, што адбываецца ў краіне з бізнесам у цэлым, з асобнымі нашымі партнёрамі, кампаніямі – некаторым і рахункі заблакіравалі, і з памяшканняў выгналі.

Дарэчы, яшчэ цікавая гісторыя! Мы ж спрабуем разам з адвакатамі вярнуць майкі з надпісам «Псіхо3%». Адбыўся суд, нас аштрафавалі за няправільную перавозку тавару і няправільна аформленыя дакументы. Штраф мы аплацілі. І, здаецца, майкі павінны былі вярнуць. Але нам даслалі цікавую адпіску, што іх адправілі на нейкую экспертызу – быццам бы знайшлі там нешта ў складзе тканіны. Ну вось усё яшчэ чакаем вынікаў.

– Але, як кажуць, усё да лепшага! Зараз зробіце такую краму, дзе ўсё, ад вентыляцыі да пажарнай сістэмы, будзе па апошнім піску моды!

– Шчыра кажучы, мы ўжо даўно з гэтага памяшкання выраслі, і ў светлай беларускай будучыні, спадзяюся, будзем мець суперсучасную краму ў адным з папулярных гандлёвых цэнтраў Мінска.

– Дарэчы, а што зараз перашкаджае мець кропку у тым жа "Трыне"?

– Камерцыйная рызыка. Мы можам, з аднаго боку, заехаць у нейкае памяшканне ў элітным месцы з дарагой арэндай, але гэты бізнес не вельмі стабільны, таму могуць і не рызыкнуць пусціць такую краму, як наша. Спрабаваць можна, але я ўпэўнены, што наўрад ці нешта добрае з гэтага атрымаецца. Мы робім сваю справу, займаемся папулярызацыяй нацыянальных сімвалаў. Мы не здаліся, не апусцілі рукі, працуем, але на той хуткасці, на якой гэта зараз можна рабіць.

Марына КОКТЫШ.

ПАЗІЦЫЯ

«Спартыўныя чыноўнікі не могуць уплываць на мае погляды...»

Капітан зборнай Беларусі па рэгбі Марыя ШАКУРА, якая днямі выйшла на волю з ізалятара, распавяла "Народнай Волі" пра свае спартыўныя захапленні і жыццёвыя прынцыпы.

Марыя ШАКУРА – адна з тых спартсменак, хто падпісаў петыцыю з патрабаваннем адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі і спынення гвалту ў краіне. Яна – капітан зборнай Беларусі па рэгбі і каманды "Гражданочка", бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы па пляжным рэгбі 2017 года.

– Калі ў Беларусі пачаліся сумна вядомыя падзеі, я была гатова да таго, што і сама ў любы момант магу апынуцца за кратамі, – шчыра прызнаецца Марыя. – Разлічвала на самы горшы зыход, рыхтавала сябе да 15 сутак арышту, бо бачыла, што абсалютна любы чалавек можа сёння патрапіць пад рэпрэсіі. Трапіла гэтая куля і ў мяне.

– Многія спартсмены кажуць, што да выбараў яны былі абсалютна апалітычныя...

– Свой погляд на тое, што адбываецца ў краіне, у мяне быў заўсёды, але пасля 9 жніўня я стала больш актыўна выказваць уласную пазіцыю.

І хачу сказаць, што мяне падтрымлівала не толькі каманда, а наогул усе тыя, хто ведае. Атрымала столькі добрых слоў, пазітыву і дапамогі, што гэта толькі дадало сіл.

– Спартыўныя чыноўнікі не спрабавалі вярнуць вас з "крывой дарожкі" на "правільны шлях"?

– Справа ў тым, што рэгбі ў Беларусі – не вельмі папулярны від спорту. Колькі мы ні хадзілі ў Міністэрства спорту і турызму з просьбай аказаць дапамогу, выніку не было. Спонсараў таксама на гарызонце неназіралася.

Таму ўсе рэгбісты ў Беларусі – гэта аматары, і тыя самыя спартыўныя чыноўнікі не маюць да нас абсалютна ніякага дачынення. Раней мы наогул былі дваравой камандай без юрыдычнага статусу, але пазней зарэгістравалі грамадскае аб'яднанне. Але ў выніку і яно спыніла існаванне, бо не было сродкаў нават на тое, каб аплаціць нейкія элементарныя рэчы.

Зараз мы каманда энтузіястаў, самастойныя людзі. Тое ж самае Міністэрства спорту не можа ніякім чынам на мяне ўплываць.

– Як вас затрымлівалі?

– Гэта адбылося 11 кастрычніка ў Мінску на вуліцы Кальварыйскай. Быў нядзельны марш, я стаяла асобна, на тратуары. А сілавікі вельмі любяць хапаць менавіта тых людзей, якія знаходзяцца не ў натоўпе.

Пацягнулі ў аўтазак, але я не супраціўлялася. Заўважыла таксама, што да дзяўчат менш гвалту ўжываюць, чым да хлопцаў. У аўтазаку, напрыклад, дзяўчаты сядзелі на лаўцы, а мужчыны стаялі на каленях з рукамі за галавой і тварам у падлогу.

Многія былі збіты, адзін сядзеў з акрываўленай галавой. Калі выходзілі з аўтазака, нейкі мужчына ляжаў на зямлі, яго ванітавала. Магчыма, было страсенне мазгоў. У выніку чалавека забрала хуткая дапамога.

У РУУС правяла амаль сем гадзін, а затым частку затрыманых адправілі ў Жодзіна, а частку – у Ізалятар часовага ўтрымання на Акрэсціна. Дарэчы, ведаю, што ў Жодзіне практычна ўсім суд даваў штрафы, а на Акрэсціна – суткі адміністрацыйнага арышту.

– 10 сутак, якія вам прысудзілі, не былі шокам?

– Як ужо казала, рыхтавалася да горшага, таму спакойна паставілася да сітуацыі, маральна была падрыхтавана.

Адзінае, што адчувала ў той момант, – неверагодную злосць на ўсю гэтую абсурдную сітуацыю, бо ты разумееш, што праўда на тваім баку, але на іх баку – сіла. І з гэтым нічога не можаш зрабіць.

– Многія скардзіліся на ўмовы ўтрымання ў ізалятары...

– Справа ў тым, што ў хуткім часе мяне перавезлі адбываць пакаранне ў Жодзіна, а там умовы былі значна лепшыя, чым на Акрэсціна. Мы мелі неабходныя сродкі гігіены, паперу для прыбіральні, матрацы з бялізнай.

А затым перавялі да нас жанчын, якія сядзелі разам з баскетбалісткай Аленай Леўчанка на Акрэсціна. Там і сапраўды былі жахі! Распавядалі, што спалі на газетах на драўляных насцілах.

– У ізалятары, можа быць, была магчымасць падтрымліваць фізічную форму?

– На вуліцы не было магчымасці, не маглі нават дапрасіцца, каб на прагулку вывелі. Я сядзела ў камеры з дзяўчатамі з Каардынацыйнай рады, і мы кожную раніцу пасля сняданку арганізоўвалі зарадку. Нехта прысядаў, хтосьці адціскаўся, таму з фізкультурай былі на сяброўскай назе. А на вуліцу за тыдзень выводзілі ўсяго два разы на 15 хвілін. Пастаялі, паглядзелі на неба ў клетку.

– А як у камеры бавілі час, чым сябе займалі?

– Магчыма, "суткі" я перанесла б значна горш, калі б у камеры не падабралася неверагодна крэатыўная і цікавая публіка. Напрыклад, Вольга Шпарага – кандыдат філасофскіх навук – кожны дзень праводзіла лекцыі на філасофскія тэмы.

Пасля абеду маглі арганізаваць які-небудзь семінар-абмеркаванне альбо спартыўныя заняткі. Спявалі песні, малявалі, складалі розныя календары. Адным словам, наш калектыў зрабіў усё, каб "суткі" праляцелі як мага хутчэй.

– Трэба думаць, што ежа там таксама была не рэстаранная...

– Мне ў гэтым плане было, напэўна, складаней прызвычаіцца, чым іншым, бо я – вегетарыянка і не ўжываю мяса.

У 6 гадзін раніцы падымаліся пад гімн Беларусі, затым нам неслі сняданак – кашу і гарбату. На абед я звычайна ела толькі суп.

Выратоўвалі перадачы, таму што там былі садавіна і гародніна. Мне хлопец перадаў вегетарыянскую кілбасу, і яна, як кажуць, зайшлі ўсім – і вегетарыянцам, і невегетарыянцам.

Таксама заставалася шмат ежы ад тых, хто ўжо выйшаў на волю, – арэхі, вафлі, шакаладкі.

– Як вас сябры і блізкія сустракалі?

– Ведаеце, калі ўбачыла, колькі людзей прыйшло сустракаць, то адчула неверагодны душэўны ўздым. Прыехалі суседзі, якіх бачыла, можа быць, усяго некалькі разоў, далёкія знаёмыя, спартсмены, музыканты. Сустракала нават дзяўчына, з якой ехалі ў аўтазаку, а ў РУУС я яе падбадзёрвала. Яна прывезла мне плед, і гэта так расчуліла, што я нават расплакалася.

Пазней даведалася, якая інфармацыйная хваля ўзнялася ў СМІ пасля майго затрымання. Мноства людзей пісалі мне паведамленні ў сацыяльных сетках, нават да гэтага часу не ўсё праглядзела. Не чакала такой салідарнасці і падтрымкі нават ад незнаёмых людзей.

– На працы праблем у вас не было?

– Я працую на прыватным прадпрыемстве, і начальства паставілася да сітуацыі з разуменнем. А ў камандзе, як ужо казала, у нас поўнае аднадумства. Усе усё разумеюць...

Алесь СІВЫ.

ШАХМАТЫ

Затое не фейк...

У некаторых шахматных (і не толькі шахматных) выданнях у свой час з'яўлялася інфармацыя: маўляў, Караль Вайтыла, будучы Папа Рымскі Іаан Павел II, у 1950–1970-х гадах гуляў у турнірах па перапісцы і нават змясціў у польскай прэсе шэраг сваіх задач. Напрыклад, такую ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крh4, Фс7, Cd4, Кс4 (4).

Чорныя: Кре6 (1).

Мат за 2 хады.

Як бы мы ні жадалі далучыць папулярнага каталіцкага першасвятара да свету шахмат, але ўсё ж, як пазней высветлілася, згаданая інфармацыя была, як цяпер сказалі б, фейкам.

А вось наступную кампазіцыю склалі ў 1984 годзе маладыя лунінецкія шахматысты, сябры па школьнай камандзе пачатку 1980-х гадоў: **Вадзім Жылко** (цяперашні вядучы гэтага аддзела) і **Віталь Тупека** (з нядаўняга часу – мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, патрыяршы экзарх усяе Беларусі). Задача "вучнёўская" па змесце, затое не фейкавая!

Белыя: Кра4, Фf8, Лg5, Лh3, Cb7, Cd8, Kb3, Kd1, пп. a5, a6, f2 (11).

Чорныя: Крс4, Cf5, Cg3, Kg2, пп. a7, c3, c5, e6, g6, h4 (10).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі ***(220030 г.Мінск, вул. Энгельса, 34а)*** або на электронны адрас: ***vadim_ne67@mail.ru***.

Далучыліся да калег

У мінулым выпуску мы згадвалі шахматыстаў, якія падпісалі зварот за сумленныя выбары і супраць гвалту. Да спісу далучыліся майстры спорту **Таццяна Берлін** і **Наталля Кусянкова**, кандыдаты ў майстры **Уладзіслаў Закржэўскі** і **Анастасія Сяленчык**, чэмпіён краіны па хуткіх шахматах і пераможца першай лігі чэмпіянату Беларусі **Дзяніс Трыфанаў**.

Залаты медаль!

Сёлетні чэмпіянат Еўропы сярод юнакоў і дзяўчат праходзіў як анлайн-турнір. Сярод юнакоў да 14 гадоў бронзу атрымаў **Дзяніс Лазавік.** Чэмпіёнка Беларусі сярод жанчын **Аляксандра Тарасенка** з Брэста заваявала золата сярод дзяўчат да 14 гадоў. Вось дзве партыі чэмпіёнкі.

Аляксандра Тарасенка – Эла Раманава (Славакія)

1.e4 c5 2.c3 d5 3.ed Ф:d5 4.d4 Kf6 5.Kf3 Kc6 6.Ce3 Cg4 7.Ce2 e6 8.0-0 Ce7 9.dc 0-0 10.b4 Фf5 11.Kbd2 Лfd8 12.Фа4 Kd5 13.Фb3 Cf6 14.Лас1 К:e3 15.fe Фh5 16.Ke4 Лd7 17.h3 Cf5 18.К:f6+ gf 19.Ke5 Фg5 20.К:d7, 1:0.

Аня Ёванавіч (Сербія) – Аляксандра Тарасенка

1.e4 c5 2.c3 d5 3.ed Kf6 4.Kf3 K:d5 5.d4 cd 6.cd g6 7.Cc4 Kb6 8.Cb3 Cg7 9.h3 0-0 10.0-0 Kc6 11.Ce3 Cf5 12.Kc3 Ka5 13.Лс1 K:b3 14.Ф:b3 Ce6 15.Фс2 Лс8 16.Лfd1 Kd5 17.Фd2 Фа5 18.К:d5 Ф:d5 19.b3 С:h3 20.gh Ф:f3 21.Крh2 Лcd8 22.Лg1 Ce5+, 0:1.

Прывітанне з Урала

Беларускія шахматысты **Кірыл Ступак**, **Аляксей Аляксандраў** і **Вольга Бадэлька** ўзялі ўдзел у двух міжнародных турнірах у Чалябінску: мемарыялах Ігара Курносава (па хуткіх шахматах) і Аляксандра Панчанкі (па "класіцы"). Вось дзве партыі з Мемарыялу А.Панчанкі.

Роберт Сафін – Аляксей Аляксандраў

1.d4 Kf6 2.c4 e6 3.Kf3 d5 4.g3 dc 5.Cg2 Kc6 6.Фа4 Cb4+ 7.Cd2 Kd5 8.С:b4 Kd:b4 9.0-0 Лb8 10.Kc3 a6 11.Ke5 0-0 12.К:c6 К:c6 13.С:c6 bc 14.Ф:c4 Фd6 15.e3 Л:b2 16.Лab1 Лb6 17.f4 a5 18.Фс5 Ф:c5 19.dc Л:b1 20.Л:b1 Ca6 21.Лd1 h6 22.Крf2 Лb8 23.Лb1 Лb4 24.Л:b4 ab 25.Ke2 Cc4 26.Kc1 f5 27.Кре1 e5 28.fe Крf7 29.Крd2 Кре6 30.Kd3 С:a2 31.К:b4 Cd5 32.Ка6 Кр:e5 33.К:c7 g6 34.Ke8 Cf7 35.Kd6 Ce6 36.Крd3 Крd5 37.Kb7 Cc8 38.Kd6 Ca6+ 39.Крс3 Кр:c5 40.Kf7 Cc8 41.Ke5 g5 42.Kf3 Крd5, 0:1.

Кірыл Ступак – Цімур Сафін

1.d4 Kf6 2.Kf3 e6 3.g3 d5 4.Cg2 Ce7 5.c4 0-0 6.0-0 dc 7.Ke5 Kc6 8.К:c6 bc 9.Ka3 С:a3 10.ba Kd5 11.Фа4 Kb6 12.Фа5 Ф:d4 13.Ce3 Фb2 14.С:c6 Cd7 15.С:a8 Л:a8 16.Лfe1 Фb5 17.С:b6 cb 18.Фс3 Фс5 19.Лed1 Ca4 20.Лd4 b5 21.Лb1 e5 22.Лd2 f6 23.Фf3 Лс8 24.Лd7 Крh8 25.Лd5 Фс7 26.Фс3 Лd8 27.Л:d8+ Ф:d8 28.Лb2 h6 29.Лd2 Фс7 30.Лd5 Фс6 31.Фf3 Фс7 32.Фg4 Фf7 33.Лd8+ Крh7 34.Фf5+ g6 35.Фс8, 1:0.

Што за пазнака?

Нашы чытачы звярнулі ўвагу на пазнаку zz, якая часам сустракаецца ў рашэнні задач. Гэта скарочаны тэрмін "цугцванг" – становішча, калі адзін з бакоў у задачы ці партыі не мае добрых хадоў, таму вымушаны рабіць дрэнны, пагаршаючы сваю пазіцыю. Слова "цугцванг" папулярнае і сярод палітычных аглядальнікаў, хоць нярэдка яго блытаюць з "цэйтнотам" (недахопам у шахматыста часу).

Праверце адказы

Задача **М.Кошаля**, змешчаная ў "Народнай Волі" 2 кастрычніка, рашаецца: **1.Ф:e4!** Не вядуць да мэты спробы 1.Фh2? Лg3! і 1.Фh5? c3!

Першымі правільна рашылі **Васіль Жуковіч**, **Славамір Буката**, **Ігар Ананіч**, **Віктар Жук**, **Сяргей Цяльпук**.

На шэраг ранейшых задач даслалі правільныя адказы **Ігар Гулік**, **Алесь Заранок**, **Максім Собаль**, **Леанід Калодка**. Дзякуем за дасланы ліст і **Святлане Сеўругінай** з Брэста.

Вадзім ЖЫЛКО.

ВНЕ ИГРЫ

«Оперативно вписались за того, кто сдавал матчи...»

Дисциплинарный комитет Федерации хоккея Беларуси сократил дисквалификацию бывшего капитана «Динамо-Молодечно» Сергея Шелега, которого осудили за организацию договорного матча с «Могилевом».

Напомним, что в сентябре этого года суд Московского района Минска вынес приговор хоккеистам **Александру Сырею**, **Никите Устиненко**, **Алексею Иванову** и **Сергею Шелегу**, которые обвинялись *«в противоправном влияния на ход матча чемпионата Беларуси по хоккею «Динамо-Молодечно» – «Могилев»* в ноябре 2019 года.

В том матче «Динамо-Молодечно» по ходу игры выигрывало со счетом 5:1, но в итоге уступило – 5:6. Игра была договорной, позже Сырей, Устиненко, Иванов и Шелег признали свою вину. За проигрыш хоккеистам обещалось на всех от 7 до 15 тысяч долларов.

В итоге Иванов был оштрафован на 500 базовых величин (13.500 рублей), Устиненко попал под амнистию и в отношении него было прекращено производство по уголовному делу, а Сырея и Шелега суд приговорил к наказанию в виде двух лет лишения свободы с испытательным сроком два года и отсрочкой приговора. Кроме того, оба хоккеиста оштрафованы на 100 базовых величин каждый (2700 белорусских рублей).

«Я искренне сожалею, что попал в такую ситуацию, – сказал на суде Шелег. – *Реально нарушил закон. Понимаю, что нет никаких оправданий действиям, которые совершил.*

Что сказать еще?.. Прошу у всех прощения. В первую очередь хочу попросить прощения у своей семьи. У общественности. Общественность останется, и она всегда будет осуждать мой поступок. Мне теперь с этим жить».

Сейчас федерация в два раза сократила спортивную дисквалификацию Сергея Шелега, и если Международная федерация хоккея примет позицию белорусской стороны, то срок отстранения Шелега, который изначально равнялся одному году, истечет уже 1 декабря этого года.

Кстати, более 100 хоккеистов чемпионата Беларуси поручились за отстраненных спортсменов и ходатайствовали о снятии с них спортивной дисквалификации.

«Учитывая полное признание вины, раскаяние в содеянном и принятие игроком мер по восстановлению репутации и доверия к себе – активную работу по восстановлению своей репутации, информационно-просветительскую и благотворительную деятельность, – члены дисциплинарного комитета приняли решение об уменьшении срока спортивной дисквалификации на 6 месяцев», – сообщили в федерации.

Некоторые болельщики на форумах так оценили решение федерации и поддержку хоккеистами осужденных коллег: *«Вот это редкостное единодушие, достойное всяческих похвал! Можно было бы так же массово поддержать баскетболистку Елену Левченко, которая за свою позицию отсидела на «сутках», или чемпионку мира по фристайле Сашу Романовскую, которую уволили из РЦОП.*

Но нет же – лучше дружно поддержим дисквалифицированных за договорные матчи.

Молодцы! Оперативно вписались за того, кто сдавал матчи и обманывал зрителей».

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Отпечатано в АО «Прайм Принт Москва», 141707,МО, г.Долгопрудный, Лихачевский пр-д, 5В. Подписано в печать 26.10.2020 в 17.00. Объем 4 печ. листа. Тираж 30000 экз. Заказ №2818.